Піліпейка С.М., студ. гр. 112 ФК і СКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Бабко А.І.,
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт

**ПРАБЛЕМА ЎЗАЕМАДАЧЫНЕННЯЎ НАВУКІ І РЭЛІГІІ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што ўяўляюць сабой сёння адносіны навукі і рэлігіі і якімі яны былі раней?

Я пачну з азначэння навукі і рэлігіі. У маім разуменні навука – гэта дзейнасць чалавека, накіраваная на збор разнастайных фактаў, на іх асэнсаванне, аналіз, абагульненне, іх тэарытычнае тлумачэнне. Рэлігія – засваенне чалавекам свету, на аснове веры ў звышнатуральныя сілы. Важным і цікавым пытаннем у дадзеным кантэксце з'яўляецца пытанне аб суадносінах іх духоўнага патэнцыялу. На маю думку, рэлігія мае больш высокі духоўны патэнцыял, чым навука, паколькі рэлігія – гэта сфера высокіх пачуццяў і высокіх думак. А навука мае рацыянальны і прагматычны характар. На жаль, сучасны чалавек аддае перавагу хутчэй прагматыцы і розуму, чым высокім пачуццям.

У кожнага чалавека існуе патрэба ў веры, але вера, у сваю чаргу, шмат патрабуе ад чалавека, і ён не заўжды ў стане адпавядаць гэтым патрабаванням. Дзякуючы веры чалавек набліжаецца да вечных пытанняў, да пытання аб сваей існасці, аб сэнсе свайго існавання ў гэтым свеце. Але да яе неабходна дарасці, а гэта не проста. І таму атрымліваецца так, што адны схілены ў бок навукі і яна для іх рэлігія, другія – ў бок рэлігіі і для іх яна як навука. Але існуюць і тыя, хто імкнецца сінтэзаваць у сабе і навуку, і рэлігію.

Шматвякавая спрэчка паміж гэтымі двума асілкамі да гэтага часу не вырашана, і сусветнае панаванне не замацавана ні за адным з іх. У эпоху Сярэдневечча панавала рэлігія, аднак у Новы час навука выходзіць з-пад яе ўлады і набывае большае значэнне. У выніку узнікла тэхнагенная цывілізацыя, у

якой грунтоўная роля належыць навуцы. Але ў рамках гэтай цывілізацыі выяўляюцца ўсе больш вострыя супярэчнасці (экалагічны крызіс, пагроза самазнішчэння чалавецтва ў атамнай вайне, міжнародны тэрарызм і г.д. ). І такая сітуацыя паказвае з ўсёй відавочнасцю неабходнасць звароту да высокіх духоўных каштоўнасцей рэлігіі. Сучаснаму чалавеку важна адчуць і ўсвядоміць, што ён створаны па вобразе і падабенстве Боскім. Таму ён здольны і павінен вырашыць згаданыя супярэчнасці.

Працэс развіцця навукі і тэхнікі не стаіць на месцы, але надзвычай важна, каб ён грунтаваўся на высокіх прынцыпах і каштоўнасцях. Але гэта не азначае выртання да дыктату рэлігіі і царквы ў дачыненні да навукі, як гэта было ў Сярэдневеччы. Навука павінна выконваць сваю прагматычную функцыю, а рэлігія – духоўную, і кожная павінна займаць сваё адпаведнае месца ў грамадстве.

У сувязі з некаторымі навуковымі адкрыццямі (напрыклад, у сувязі з эвалюцыйнай тэорыяй Дарвіна), ва ўзаемадачыненнях паміж навукай і рэлігіяй узнікалі вострыя праблемы. У іншых навуковых адкрыццях, напрыклад, у тэорыі Вялікага Выбуху, прадстаўнікі царквы і рэлігійнай філасофіі бачылі пацверджанне рэлігійных палажэнняў [1, с. 59]. Але і той, і другі шлях памылковы, бо навука і рэлігія розныя па сваей сутнасці, характары, змесце, духоўным напаўненні.

Такім чынам, рэлігія вызначае духоўнасць чалавека, фарміруе яго самасвядомасць. Навука дае яму, у канчатковым выніку, жыццёвыя даброты і шчадроты. Разам яны робяць каласальную працу ў імя развіцця грамадства, і ў імя развіцця чалавека. Разнагалоссі паміж навукай і рэлігіяй на сёняшні дзень маюць згладжаны характар. Яны выйшлі на новы ўзровень зносін паміж сабою, вырашаючы магчымыя праблемы ў сваіх узаемаадносінах ў рамках канструктыўнага дыялогу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс літаратуры:

1. Rosmorduc, J.  25 mot clés de la culture scientifique /J. Rosmorduc, D. L'Elchat. – Paris:  Succes du livre, 2004. – 386p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ